*Пасольства Польшчы ў Рэспубліцы Беларусь*
*Польскі Інстытут у Мінску*
*Беларускі дзяржаўны універсітэт*
*Універсітэт Мікалая Каперніка ў Торуні*

Да 90-годдзя прыняцця Рыжскага дагавору 1921 г.

# МАТЭРЫЯЛЫ

## з гісторыі польска-беларускіх узаемаадносін у XX ст.

---

*Зборнік навуковых прац*
*III міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі.*
*Мінск, 9-10 чэрвеня 2011 г.*

W dziewięćdziesiątą rocznicę traktatu ryskiego 1921 r.

# STUDIA

## z dziejów stosunków polsko-białoruskich w XX w.

---

***Zbiór prac naukowych III Międzynarodowej Konferencji Historycznej. Mińsk 9-10 czerwca 2011 r.***

Мінск
ТАА «Ковчег»
2011

УДК 94(476+438)"19"
ББК 6.3.3(0)6(4Беи)
Д 33

Рэдакцыйная калегія:
*Вітольд Вайдыла, Збігнев Карпусь, Віктар Шадурскі, Вальдемар Рэзмер, Альгіс Каспяравічус, Уладзімір Снапкоўскі, Рыгор Лазько, Міхал Клімецкі.*

Kolegium redakcyjne:
*Zbigniew Karpus, Algis Kaspariaviczus, Michał Klimecki, Ryhor Łażko, Waldemar Rezmer, Uładzimir Snapkouski, Wiktar Szadurski, Witold Wojdyło.*

Рэцэнзенты:
*Доктар гістарычных навук, прафесар Уладзімір Навіцкі,*
*Доктар гістарычных навук, прафесар Уладзімір Тугай.*

Recenzenci:
*prof. dr hab. Uładzimir Nawicki, prof. dr hab. Uładimir Tuhaj.*

Tłumaczenia streszczeń na język angielski:
*Witold Czartoryski, Natallia Karpovich, Tatiana Tulus-Aleksandrovic.*

**Д33** Да 90-годдзя прыняцця Рыжскага дагавору 1921 г. Матэрыялы з гісторыі польска-беларускіх узаемаадносін у XX ст. Зборнік навуковых прац III міжнароднай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі. Мінск, 9-10 чэрвеня 2011 г. Навук. рэд. Е. Расоўска, А. Вялікі; Мн. 2011. – 344 с.

W dziewięćdziesiątą rocznicę traktatu ryskiego 1921 r. Studia z dziejów stosunków polsko-białoruskich w XX w. Zbiór prac naukowych III Międzynarodowej Konferencji Historycznej. Mińsk 9-10 czerwca 2011 r. Praca zbiorowa pod redakcją E.Rosowskiej i A Wialikiego. Mińsk 2011, s. 344.

ISBN 978-985-7006-89-02

Зборнік навуковых прац утрымлівае матэрыялы III міжнароднай канферэнцыі гісторыкаў, якая адбылася ў Мінску 9-10 чэрвеня 2011 г. Канферэнцыя праходзіла пад патранатам Пасольства Польшчы ў Рэспубліцы Беларусь, Польскага Інстытуту ў Мінску, Беларускага дзяржаўнага універсітэта, універсітэта Мікалая Каперніка ў Торуні. Канферэнцыя прысвечана 90-годдзю з дня падпісання Рыжскага мірнага дагавору 1921 г.

Publikacja zawiera materiały III Międzynarodowej Konferencji Historyków, która odbyła się w Mińsku w dniach 9-10 czerwca 2011 r. Konferencja, zorganizowana przez Ambasadę RP w Mińsku, Instytut Polski w Mińsku, Białoruski Uniwersytet Państwowy i Uniwersytet Mikołaja Kopernika w Toruniu poświęcona była dziewięćdziesiątej rocznicy podpisania traktatu ryskiego 1921 r.

**ISBN 978-985-7006-89-02**

© Ambasada RP w Mińsku, 2011
© Instytut Polski w Mińsku, 2011
© Калектыў аўтараў кнігі, 2011
© Е. Расоўска, А. Вялікі, укладанне, 2011
© ТАА "Ковчег", афармленне, 2011

**Аляксандр Вабішчэвіч**

## Палессе ў палітычнай тэорыі і практыцы польскіх улад (1921–1939 гг.)

Паводле Рыжскага мірнага дагавора 18 сакавіка 1921 г. у склад Польшчы разам з іншымі заходнебеларускімі землямі была ўключана і заходняя частка Палесся. Беларускія этнічныя тэрыторыі (Брэсцкі, Драгічынскі, Кобрынскі, Косаўскі, Лунінецкі, Пінскі, Пружанскі, Столінскі паветы) разам з населенымі ўкраінцамі Камень-Кашырскім і Сарненскім паветамі ўвайшлі ў Палескае ваяводства.

У межах Польскай дзяржавы Палескае ваяводства з'яўлялася адсталым аграрным рэгіёнам, якое не мела індустрыяльнай базы, сацыяльна-культурнай і адукацыйнай інфраструктуры, належных транспартных камунікацый (чыгуначных і шасейных дарог). У папярэднія гады Першай сусветнай вайны, савецка-польскага ваеннага супрацьстаяння палескі рэгіён меў вялікія матэрыяльныя і людскія страты.

Спецыфічнай была і этнаканфесійная структура насельніцтва Палескага ваяводства. Паводле афіцыйных вынікаў перапісу насельніцтва 1921 г., у Палескім ваяводстве большасць складалі беларусы (42,6 %), палякаў налічвалася 24,3 %, украінцаў – 17,7 %, яўрэяў – 10,4 %, іншых – 5 %)[1]. У сакавіку 1925 г. на тэрыторыі Палескага ваяводства найбольшая польская прысутнасць назіралася ў наступных паветах – у Брэсцкім павеце (22 953 чалавекі, з іх 11 481 – у Брэсце), Пружанскім (10 886), Пінскім (8105, з іх 3276 – у Пінску), Лунінецкім (7337), Кобрынскім (3970), Косаўскім (3164), Драгічынскім (2323), Столінскім (1181)[2]. Большасць насельніцтва Палескага ваяводства (76,5 %) складалі праваслаўныя (1931 г.)[3].

Менавіта ўсе гэтыя акалічнасці неабходна было ўлічваць польскім уладам, асабліва на ваяводскім узроўні. Аўтарам аднаго з рэгіянальных праектаў выступіў у лютым 1923 г. палескі ваявода С. Даўнаровіч[4]. Прапанаваныя ім мерапрыемствы (будаўніцтва дарог, аднаўленне жыллёвага фонду, гідрамеліярацыйныя работы, камасацыя зямель, урэгуляванне справы з сервітутамі, добраўпарадкаванне і рост гарадоў) патрабавалі значных капіталаўкладанняў, эканамічнай актыўнасці, аднак дазволілі б паскорыць працэс паланізацыі Палесся для пераўтварэння яго ў «новы галоўны ключ для панавання на ўсходзе». На думку С. Даўнаровіча, для дасягнення гэтай мэты

---

[1] Rocznik statystyczny, Warszawa 1924, s. 12–14.
[2] Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Ф. 67. – Воп. 1. – Спр. 601. – Арк. 2–6.
[3] E. Mironowicz, S. Tokć, R. Radzik, *Zmiana struktury narodowościowej na pograniczu polsko-białoruskim w XX wieku*, Białystok 2005, s. 43.
[4] Archiwum Akt Nowych w Warszawie (AAN). – Zespół 9/1. – Sygnatura 938. – K. 1–18.

неабходна было перагледзець адміністрацыйныя межы Палескага ваяводства, абараніць яго ад беларусізацыі з поўначы і ўкраінізацыі з поўдня, стварыць згуртаваную мясцовую адміністрацыю, якая «мае высокае ўсведамленне задач і надзелена значнай уладай», наладзіць супрацоўніцтва рымска-каталіцкай і праваслаўнай цэркваў з урадам «на карысць польскай дзяржаўнай ідэі», разгарнуць у Палескім ваяводстве напружаную, мэтанакіраваную інвестыцыйную палітыку, аднавіць і пашырыць гарады, правесці їх паланізацыю, упарадкаваць гаспадарчыя адносіны мясцовага вясковага насельніцтва, ажыццявіць сістэматычную, планавую польскую каланізацыю»[1]. У бліжэйшай перспектыве Палессе павінна было стаць рэгіёнам дамінавання польскага ўплыву, буферам паміж беларускімі і ўкраінскімі землямі. Праект С. Даўнаровіча, што разглядаўся як частка канцэптуальных падыходаў урада У. Сікорскага па рэгіяналізацыі нацыянальнай палітыкі і мадыфікаваўся наступнымі ваяводамі, да канца міжваеннага перыяду прызнаваўся самым аптымальным для вырашэння нацыянальных праблем у рэгіёне[2]. Аднак да яго практычнай рэалізацыі справа не дайшла.

З устанаўленнем у 1926 г. рэжыму «санацыі» Ю. Пілсудскага асобныя планы рэгіяналізацыі палескага рэгіёна не распрацоўваліся. Хоць Палессе трактавалася ў якасці тэрытарыяльна-адміністрацыйнай адзінкі, пазбаўленай як беларускага, так і ўкраінскага этнічнага кантэксту, аднак дзеянні мясцовых улад да пачатку 1930-х гг. не адрозніваліся ад тых, што ажыццяўляліся ў суседніх ваяводствах (Навагрудскім, Віленскім, Беластоцкім).

Вынікі перапісу насельніцтва 1931 г. не засведчылі выразнай тэндэнцыі паланізацыі на тэрыторыі Палескага ваяводства. У Брэсцкім павеце з агульнай колькасці жыхароў польская мова ў якасці роднай была пазначана ў 24,3 % (53 508 чалавек, з іх у Брэсце – 22 250 (44,2 % жыхароў горада), Пружанскім – 18 740 (17,1 %), Лунінецкім – 28 805 (15,6 %), Кобрынскім – 9905 (8,7 %), Косаўскім – 8283 (9,9 %), Драгічынскім – 7016 (7,2 %), Столінскім – 18 292 (14,6 %). У Пінску зафіксавана 7217 польскамоўных (22,3 %). Усяго ў Палескім ваяводстве адзначана 166 332 чалавекі, роднай мовай якіх паказана польская (14,7 %)[3]. Адначасова больш за 707 тыс. чалавек зафіксаваны «тутэйшымі» (68,2 % насельніцтва)[4]. З польскага боку (асабліва ваяводскай адміністрацыі) іх

---

[1] Там жа, к. 5–6.

[2] W. Śleszyński, *Bespeczeństwo wewnętrzne w polityce państwa polskiego na ziemiach północno-wschodnich II Rzeczypospolitej,* Warszawa 2007, s. 172; Сляшыньскі, В. Нацыянальная палітыка польскіх улад на землях Усходняй Літвы і Заходняй Беларусі / В. Сляшыньскі // Беларускі гістарычны часопіс. – 2006. – № 9. – С. 11.

[3] ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 9. – Спр. 2253. – Арк. 8; ДАБВ. – Ф. 2. – Воп. 1, – Спр. 4968. – Арк. 79.

[4] E. Mironowicz, *Zmiana struktury narodowościowej na pograniczu polsko-białoruskim w XX wieku*, op.cit., s. 42.

разглядалі як нацыянальна несвядомых ці як тэрытарыяльна-дыялектную групу польскага этнасу. У сваю чаргу ўкраінскія дзеячы (пераважна з Галіцыі) безапеляцыйна заяўлялі аб прыналежнасці Палесся да ўкраінскай этнічнай тэрыторыі, а «тутэйшых» бяздоказна прызнавалі ўкраінцамі. Абсалютызуючы моўныя асаблівасці мясцовага насельніцтва, што было характэрным для беларуска-ўкраінскага памежжа, не ўлічвалася і ігнаравалася пры гэтым агульнасць яго эканамічнага, грамадска-палітычнага жыцця, неадрыўная сувязь з гісторыка-культурным развіццём беларускага этнасу.

Нягледзячы на сваю нешматлікасць, палякі знаходзіліся ў прывілеяваным становішчы. Па стане на 15 лютага 1932 г., у Палескім ваяводстве з 8204 прадстаўнікоў інтэлігенцыі палякаў было 6196 (75,5 %), яўрэяў – 799 (9,8 %), рускіх – 787 (9,5 %), украінцаў – 208 (2,5 %), беларусаў – 214 (2,5 %)[1]. Нацыянальны склад чыноўнікаў мясцовай дзяржаўнай адміністрацыі і служачых органаў самакіравання выглядаў наступным чынам: з 5120 чалавек палякаў было 4508 (88 %), рускіх – 294 (5,8 %), беларусаў – 186 (3,6 %), украінцаў – 67 (1,3 %), яўрэяў – 65 (1,3 %)[2].

Акрамя таго, сярод буйных і сярэдніх землеўладальнікаў таксама пераважалі палякі. Перад 1929 г. палякі складалі 65,2 % уласнікаў маёнткаў (плошчай больш 50 га)[3]. У 1931 г. на тэрыторыі Заходняй Беларусі было больш 8 тыс. асаднікаў, з іх у Палескім ваяводстве – 2539[4]. У 1937 г. ва ўсходніх ваяводствах колькасць вайсковых асаднікаў дасягнула 9–9,1 тыс. чалавек, а разам з цывільнымі – 16,6 тыс. чалавек, з іх на Палескае ваяводства прыходзілася 12,6 %[5].

Спробы ажыўлення рэгіянальных падыходаў у вырашэнні праблем палескага рэгёна назіраліся ў пачатку 1930-х гг. У жніўні 1932 г. палескі ваявода Я. Крагельскі накіраваў у Міністэрства ўнутраных спраў Польшчы асобную дакладную запіску[6]. Сярод найбольш важных праблем уздымалася пашырэнне польскай каланізацыі[7]. Новая хваля засялення Палесся польскімі асаднікамі звязвалася з правядзеннем яго меліярацыі. Для пашырэння каланізацыі патрабавалася падтрымка з боку дзяржавы, рацыянальнае

---

[1] ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 9. – Спр. 2253. – Арк. 23.
[2] ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 9. – Спр. 2253. – Арк. 28.
[3] J. Tomaszewski, *Z dziejów Polesia 1921–1939. Zarys stosunków społeczno-ekonomicznych*, Warszawa 1963, s. 43.
[4] Сорокин, А.А. Аграрный вопрос в Западной Белоруссии (1920–1939) / А.А. Сорокин. – Минск: Наука и техника, 1968. – С. 162.
[5] J. Stobniak-Smogoczewska, *Kresowe osadnictwo wojskowe 1920–1945*, Warszawa 2003, s. 102, 103, 243.
[6] ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 9. – Спр. 2253. – Арк. 1–39.
[7] Там жа, арк. 8.

размеркаванне ільготных крэдытаў і іншыя мерапрыемствы. Планавалася павялічыць долю палякаў на працягу 10 гадоў найперш за кошт «вельмі пасіўнага элементу» (мясцовага няпольскага насельніцтва) у ходзе яго істотнай паланізацыі. Толькі 3,8 % насельніцтва (гарадскія жыхары) былі прызнаны «польскім элементам добрай якасці», хаця і адарваным ад народных мас. Палова вясковых палякаў прылічана да поўнасцю пасіўнага насельніцтва. Паводле Я. Крагельскага, усяго актыўнага польскага элементу на Палессі налічвалася толькі 4–5 %[1]. Рассяленне нешматлікіх, распыленых груп каланістаў было прызнана нерацыянальным. Польскія памешчыкі, якія валодалі велізарнымі латыфундыямі (у Лунінецкім павеце іх уладанні складалі да 70 % лясных плошчаў; у паўночнай частцы Брэсцкага павета, Кобрынскім, Пружанскім паветах памер зямельных уладанняў вагаўся ад 100 да 500 га), слаба ўдзельнічалі ў палітычным жыцці, абмяжоўваліся адстойваннем толькі прыватнаўласніцкіх інтарэсаў. Польскія купцы і рамеснікі былі нешматлікай і слабой групай у параўнанні з яўрэйскімі гандлярамі і рамеснікамі[2]. Нешматлікай і распыленай групай была польская інтэлігенцыя. Слабаактыўнай прызнавалася засцянковая шляхта Пінскага, Столінскага і іншых паветаў, дзе «традыцыі польскай шляхты яшчэ не загінулі і могуць паслужыць асновай для вяртання да польскасці»[3]. Вайсковыя асаднікі прызнаваліся «свядомым польскім элементам», які прымаў актыўны ўдзел у грамадскім жыцці, але з-за распыленасці, даволі малой колькасці і вельмі цяжкага матэрыяльнага становішча не адыгрываў сваёй функцыянальнай ролі[4].

З прыходам да кіраўніцтва Палескім ваяводствам В. Костэк-Бярнацкага, прыхільніка радыкальнага (нацыянал-дзяржаўніцкага) крыла лагеру пілсудчыкаў, у які ўваходзіў і міністр унутраных спраў Б. Перацкі[5], быў узяты курс на паскарэнне паланізацыі дадзенага рэгіёна. Ужо ў першы год свайго кіравання палескі ваявода В. Костэк-Бярнацкі не толькі заявіў аб неабходнасці паланізацыі праваслаўнай царквы, але і зрабіў шэраг захадаў у гэтым напрамку (забарона чыноўнікам прымаць метрыкі аб нараджэнні, шлюбе, смерці на рускай мове; дамаганне ад духавенства польскамоўных казанняў; схіленне да ўвядзення грыгарыянскага календара і інш.). Такая паланізатарская пазіцыя адносна праваслаўнай царквы пачала ажыццяўляцца на заходнебеларускіх землях упершыню менавіта ў Палескім ваяводстве.

[1] Там жа.
[2] Там жа, арк. 12.
[3] Там жа, арк. 13.
[4] Там жа, – арк. 14.
[5] У час допытаў у 1950 г. В. Костэк-Бярнацкі не ўтойваў, што знаходзіўся ў «вялікім сяброўстве» з Б. Перацкім (Гл.: P. Cichoracki, *Droga ku anatemie: Wacław Kostek-Biernacki (1884–1957)*, Warszawa 2009, s. 360).

Польскія ўлады не змаглі выканаць абвешчаную цывілізацыйную місію – забяспечыць радыкальныя зрухі ў эканамічным жыцці, сацыяльнай сферы, галіне культуры, адукацыі. Палессе па-ранейшаму заставалася выключна адсталым сельскагаспадарчым рэгіёнам. Паводле ацэнкі Е. Тамашэўскага, палеская вёска міжваеннага часу знаходзілася на тым узроўні, на якім была яшчэ 50 гадоў да таго вёска царскай Расіі[1]. Лагер пілсудчыкаў ускладваў спадзяванні на паспяховую рэалізацыю каланізацыйных праектаў, асабліва пры дапамозе замежнага капіталу. Створаны Лігай Нацый асобны экспертны камітэт вывучаў у 1926 г. магчымасць меліярацыі Палесся, але сусветны эканамічны крызіс 1929–1933 гг. не дазволіў гэта выканаць. Зусім слабое інвестыцыйнае забеспячэнне мерапрыемстваў сацыяльна-эканамічнага характару на Палессі тлумачыцца не толькі негатыўным вынікам эканамічнага крызісу, але і незацікаўленасцю і недальнабачнасцю з боку цэнтральных органаў кіравання, вайсковых колаў Польшчы. У прыватнасці, памер фінансавання меліярацыі з'яўляўся мізэрным і не мог прывесці да нейкіх кардынальных зрухаў у гэтым напрамку на Палессі. Адсутнасць належных інвестыцый не дазваляла стварыць разгалінаваную сетку транспартных камунікацый, што з'яўлялася адной з прычын захавання кансерватыўна-патрыярхальнага, архаічнага гаспадарчага ўкладу палескай вёскі, агульнай эканамічнай адсталасці ўсяго рэгіёна. Калі ў сярэдзіне 1920-х гг. паказчык гушчыні чыгуначнай сеткі на Палессі адставаў у 4 разы ад агульнапольскага, то ў сярэдзіне 1930-х гг. гэты разрыў яшчэ больш павялічыўся. Паводле ацэнак Таварыства развіцця ўсходніх зямель (1937 г.), пры захаванні тагачасных памераў інвестыцый у дарожнае будаўніцтва Палесся там можна было дасягнуць такой гушчыні шасейных дарог, якая была ў цэнтральных польскіх ваяводствах, праз 140 гадоў[2]. Толькі ў другой палове 1930-х гг. удалося пашырыць сетку дарог з цвёрдым пакрыццём (у 1934–1938 гг. пабудавана больш 200 км)[3].

Складаным заставалася становішча і ў сацыяльна-культурнай сферы. У 1931 г. на Палессі непісьменныя складалі каля 35 %. У гарадах гэты паказчык вагаўся ад 12,6 % (Брэсцкі павет) да 30,4 % (Столінскі павет). Самай высокай была непісьменнасць у палескіх вёсках – ад 40 % да 68 %[4]. Тэмпы ліквідацыі непісьменнасці заставаліся павольнымі. У 1936 г. у Палескім ваяводстве 53 тыс. дзяцей школьнага ўзросту (23 %) не былі ахоплены навучаннем[5].

---

[1] J. Tomaszewski, *Z dziejów Polesia 1921–1939*, op.cit., s. 114.
[2] *Gospodarcze i kulturalne potrzeby województwa poleskiego,* Warszawa, 1937, s. 6.
[3] P. Cichoracki, *P. Droga ku anatemie,* op.cit., s. 315.
[4] *Polski stan posiadania na Polesiu,* op.cit., s. 32.
[5] Вабішчэвіч, А.М. Асвета ў Заходняй Беларусі (1921–1939 гг.) / А.М. Вабішчэвіч. – Брэст: Выд-ва БрДУ, 2004. – С. 98.

Працягвалі існаваць «бясшкольныя акругі». Для ажыццяўлення задачы ўсеагульнага пачатковага навучання не хапала не толькі дастатковай колькасці школ, але і кваліфікаваных педагагічных кадраў. Створаная школьная сетка адчувала востры недахоп настаўнікаў (тады на Палессі з неабходных 4235 працавалі толькі 2350), школьных будынкаў (1200 будынкаў – 800 арандаваныя, з іх 95 % «не адпавядалі нават сціплым патрабаванням (малыя, нізкія, цёмныя памяшканні ў палескіх хатах), больш за 200 будынкаў ніжэй усялякіх патрабаванняў, у якіх дзеці і настаўнікі трацяць здароўе», жылля для настаўнікаў[1].Пры гіпатэтычнай непарушнасці геапалітычнай сітуацыі, калі б Палессе працягвала ўваходзіць у склад Польшчы, канчатковая ліквідацыя там непісьменнасці магла расцягнуцца на некалькі дзесяцігоддзяў. Існуючыя польскія школы абцяжарвалі вучням доступ да сярэдняй і вышэйшай адукацыі. У Палескім ваяводстве ў 1939 г. з 1075 пачатковых школ першай ступені было 811, другой – 170, трэцяй – толькі 94[2].

З сярэдзіны 1930-х гг. і ў Варшаве, і на ваяводскім узроўні распрацоўваліся планы па паскарэнні каланізацыі, нацыянальна-культурнай асіміляцыі мясцовага насельніцтва. Актыўна выкарыстоўваліся вынікі навуковых даследаванняў Л. Асоўскага, Ю. Тарнацкага, Ю. Абрэмбскага, С. Фагельсона, Л. Градзіцкага і іншых польскіх вучоных. Палескай праблематыцы быў прысвечаны асобны І Справаздачна-навуковы з’езд (Варшава, 20–21 верасня 1936 г.), арганізаваны Камісіяй навуковых даследаванняў усходніх зямель.

Па гушчыні заселенасці (31 чалавек на 1 км²) Палессе мела ў другой палове 1930-х гг. самыя нізкія паказчыкі ў Польшчы, дзе на 1 км² прыходзілася ў сярэднім 83 чалавекі. Слабую заселенасць мелі Лунінецкі (19,1), Столінскі (23,3), Пінскі (27,1) паветы[3]. Паводле аднаго з праектаў, пасля правядзення асушэння балот планавалася выдзеліць для 100 тыс. каланістаў з цэнтральных і заходніх рэгіёнаў Польшчы 1,5 млн. га зямлі[4]. Найбольш эфектыўнымі сродкамі інтэграцыі лічыліся грамадскія работы, будаўніцтва дарог, асушэнне балот і іншыя мерапрыемствы ў галіне гаспадарчага жыцця. Паколькі гэтыя планы патрабавалі велізарных сродкаў, то меркавалася перасяліць ва ўсходнія землі звыш 200 тыс. пенсіянераў[5]. Аднак выканаць такія амбіцыйныя і адначасова авантурныя планы, распрацаваныя цэнтральнымі польскімі ведамствамі, не ўдалося. Аналіз такіх праектаў дае падставу не пагадзіцца з

---

[1] ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 2. – Спр. 3613. – Арк. 2–3.
[2] ДАБВ. – Ф. 59. – Воп. 2. – Спр. 657. – Арк. 3–4.
[3] *Polski stan posiadania na Polesiu*, op.cit. – S. 15–16.
[4] AAN. – Zespół 9/1. – Sygnatura 946. – K. 10.
[5] Там жа, к. 25.

высновамі сучасных беларускіх даследчыкаў пра тое, што польскія ўрадавыя колы былі настроены на больш памяркоўныя формы паланізацыі, а мясцовыя ўлады схіляліся да больш радыкальных метадаў[1].

Наогул, каланізацыя Палесся так і засталася да верасня 1939 г. невырашальнай задачай для польскіх улад. Сярод прычын былі як суб'ектыўныя фактары – незацікаўленасць, недаацэнка ці нават наўмысная пазіцыя польскіх урадаў, часткі польскай грамадскасці адносна захавання палескага рэгіёна ў якасці аграрна-патрыярхальнага анклаву, сацыяльна-псіхалагічныя матывы (боязь абвастрэння нацыянальных, канфесійных антаганізмаў[2]), так і аб'ектыўныя (адмоўная папярэдняя «спадчына» – слабы ўзровень цывілізацыйнага развіцця Палесся ў складзе Расійскай імперыі, значныя страты ў гады Першай сусветнай, савецка-польскай войн, а таксама фінансавыя, матэрыяльна-тэхнічныя і арганізацыйныя цяжкасці, асабліва выкліканыя ўздзеяннем сусветнага эканамічнага крызісу, і інш.). Улічваючы адставанне Палесся яшчэ да яго ўключэння ў склад Польшчы, нельга пры гэтым скідваць з рахунку невыкананне польскімі ўладамі абяцанняў адносна згаданай цывілізатарскай місіі, ажыццяўлення там прагрэсіўнага плану эканамічнага развіцця, што прызнаюць і сучасныя польскія даследчыкі.

У канцы 1936 г. уласны план адносна паланізацыі Палесся прапанавалі і вайсковыя колы (кіраўніцтва IX Корпуса аховы памежжа). Прапаноўвалася прымяняць самыя жорсткія меры, амаль да забароны дзейнасці і выдалення непажаданых «адзінак». Важнае значэнне надавалася будаўніцтву школ. Прадугледжвалася кадравая чыстка сярод настаўнікаў, праваслаўнага і каталіцкага кліру Палескага і Навагрудскага ваяводстваў[3]. Для ажыццяўлення паланізацыі планавалася прыцягнуць усе існуючыя грамадскія і асветніцкія арганізацыі.

У лісце, накіраваным у лютым 1937 г. у Міністэрства ўнутраных спраў Польшчы, палескі ваявода В. Костэк-Бярнацкі прапаноўваў на працягу бліжэйшых гадоў поўнасцю ліквідаваць «бясшкольныя акругі», прывесці існуючыя школьныя будынкі да неабходных патрабаванняў, палепшыць жыллёвыя ўмовы і забеспячэнне вясковых настаўнікаў, атрымаць дзяржаўны крэдыт на 5 гадоў на закупку драўніны для новых школьных будынкаў[4]. Ваявода выступаў таксама за паскарэнне меліярацыйных работ, пашырэнне камасацыі і інш. Больш чым 25 тыс. прадстаўнікоў засцянковай шляхты трэба

---

[1] Загідулін, А. Нацыянальная палітыка ў адносінах да беларусаў у II Рэчы Паспалітай (1921–1939 гг.) / А. Загідулін // Беларускі гістарычны часопіс. – 2004.– № 10. – С. 35.
[2] W. Śleszyński, *Bezpeczeństwo wewnętrzne w polityce państwa polskiego na ziemiach północno-wschodnich II Rzeczypospolitej*, op.cit., s. 240.
[3] ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 10. – Спр. 832. – Арк. 4.
[4] ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 8. – Спр. 1656. – Арк. 14–19.

было ўцягнуць у арбіту польскай культуры праз школы, армію, грамадскія арганізацыі[1]. Паводле заключэння В. Костэк-Бярнацкага, палескі рэгіён з'яўляўся «зручнай тэрыторыяй для гарадской каланізацыі». «Сучасныя палескія гарады і мястэчкі заселены… пераважна яўрэйскім элементам і значным працэнтам рускіх і русіфікаваных палешукоў. Польскі элемент у гарадах і мястэчках – гэта амаль выключна чыноўнікі і дзяржаўныя служачыя»[2].

На з'ездзе служачых сельскагаспадарчага апарату Палескага ваяводства 16 красавіка 1937 г. патрабавалася забараніць продаж зямлі праваслаўным, прадстаўнікам няпольскага насельніцтва[3]. Чыноўнікам дзяржаўнай адміністрацыі, органаў самакіравання прадпісвалася выкарыстоўваць у адносінах з мясцовым насельніцтвам толькі польскую мову. Не дапускаліся казанні ў праваслаўных храмах на беларускай ці ўкраінскай мовах, а толькі па-польску. У выключных выпадках можна было выкарыстоўваць рускую мову ці мясцовыя дыялекты. «Палессе так аддалена ад рускай культуры, што казанне на рускай мове не прынясе шкоды»[4]. «Лаяльны паляшук ці тутэйшы – гэта паляк. Той, хто ўказвае ў дэкларацыі нацыянальнасць беларус, украінец ці яўрэй, не можа купіць зямлі»[5]. Была таксама выказана непрымірымая пазіцыя адносна неаўніі.

На адной з канферэнцый чыноўнікаў ваяводскіх упраўленняў і кіраўнікоў Карпусоў аховы памежжа (24 красавіка 1937 г.) былі выказаны чарговыя прапановы па ўзмацненні паланізацыі. Выконваючы абавязкі палескага ваяводы, Е. дэ Трамекурт у дыскусіі адзначыў, што ў адрозненне ад беларусаў і ўкраінцаў палешукоў можна лёгка далучыць да польскай культуры. Прызнавалася, што на Палессі існавалі ўмовы для правядзення польскай каланізацыі. Прапаноўвалася ў ходзе ажыццяўлення каланізацыі ствараць адпаведныя цэнтры пашырэння польскай культуры[6]. Самакрытычна адзначалася, што асадніцтва не толькі спрыяла паланізацыі, але нават яе абцяжарвала, бо гэта былі «пераважна бедныя, ўбогія і нешматлюдныя асяродкі»[7]. Негатыўныя адносіны выказваліся адносна праваслаўнага духавенства. «Папы – гэта шкодны элемент, з якім не варта лічыцца»[8]. Крытыцы былі падвергнуты і польскія грамадскія арганізацыі. «Арганізацыі – іх вельмі шмат, не заўсёды патрэбных, маецца на ўвазе «Маладая вёска»[9].

---

[1] Там жа, арк. 21.
[2] Там жа, арк. 19.
[3] ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 10. – Спр. 1436. – Арк. 303 адв.
[4] Там жа, арк. 304 адв.
[5] Там жа, арк. 303адв.
[6] ДАБВ, Ф. 1. – Воп. 8. – Спр. 1091. – Арк. 8
[7] Там жа, арк. 5 адв.
[8] Там жа. арк. 6.
[9] Там жа.

13 кастрычніка 1937 г. палескі ваявода В. Костэк-Бярнацкі заявіў аб тым, што Палессе павінна быць польскім, нягледзячы на мясцовую гаворку і веравызнанне вялізнай большасці жыхароў, і загадаў павятовым старастам лічыць мясцовае насельніцтва польскім[1].

На пасяджэнні павятовых стараст, якое адбылося 25–26 студзеня 1938 г. у Брэсце, палескі ваявода В. Костэк-Бярнацкі вылучыў сярод галоўных задач унутранай палітыкі Польскай дзяржавы разам з праблемай абароны краіны і паланізацыю Палесся. «Палессе павінна быць засвоена польскай культурай, а ўсё насельніцтва Палесся да гэтага часу ў абсалютнай большасці нацыянальна неўсвядомленае (за выключэннем яўрэяў), прызначана для польскасці, каб неўзабаве стаць польскім»[2].

5 красавіка 1938 г. палескі ваявода разаслаў усім органам мясцовага кіравання сакрэтнае ўказанне аб прынцыпах правядзення імі нацыянальнай палітыкі адносна жыхароў Палесся. «Палешукоў, якія не прызнаюць сябе станоўча ўкраінцамі, беларусамі ці рускімі, трэба прызнаваць палякамі, нягледзячы на веравызнанне і народную гаворку»[3]. Пры гэтым даваў рэкамендацыі папулісцкага характару. «Да палешукоў і іншых грамадзян, спакойных, што цягнуцца да польскай культуры ці пасіўных адносна гэтага, трэба адносіцца з поўнай прыхільнасцю. Не трэба да іх звяртацца на «ты» ці неяк прыніжаць… Трэба заўсёды разумець іх народныя говары, аднак гаварыць да іх, як і да іншых, толькі па-польску»[4]. Чыноўнікі мясцовай адміністрацыі абавязваліся неадкладна паведамляць пра любых агітатараў, экскурсіі няпольскіх дзеячаў і г. д.

Хоць асобныя польскія даследчыкі спрабуюць паставіць В. Костэк-Бярнацкага ў адзін рад з ініцыятарамі, выканаўцамі асобных праектаў рэгіяналізацыі[5] (напрыклад, з Г. Юзэфскім, які ажыццяўляў «валынскі» праект), аднак на самай справе нейкага ўласнага, выразна акрэсленага праекта адносна Палесся ён не меў. Можна сцвярджаць аб наяўнасці шматлікіх, але разрозненых элементаў падобнага праекта ці праграмы. З'яўляючыся прыхільнікам радыкальнага, аўтарытарнага крыла лагеру пілсудчыкаў, В. Костэк-Бярнацкі рашуча не прымаў погляды і дзеянні «ліబералаў», якія ішлі хаця б на абмежаванае супрацоўніцтва з украінскім ці беларускім рухамі (да іх належаў і згаданы валынскі ваявода Г. Юзэфскі).

Аналіз палажэнняў палітыкі В. Костэк-Бярнацкага па далейшай паланізацыі Палесся, яго асабістых поглядаў наконт гэтага, сведчыць аб іх радыкальным нацыянал-дэмакратычным характары, хаця ён заставаўся адным

---

[1] ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 6. – Спр. 2608. – Арк. 30, 30 адв.
[2] ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 10. – Спр. 1436. – Арк. 302 адв.
[3] ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 8. – Спр. 1089. – Арк. 1.
[4] Там жа, арк. 1–1 адв.
[5] P. Cichoracki, *Droga ku anatemie*, op.cit., s. 292.

са «стаўпоў» лагеру «санацыі». У адным з нумароў 1938 г. «Газэты полескон», якая выдавалася падкантрольнай ваяводскаму ўпраўленню мясцовай камісіяй грамадскіх арганізацый, быў змешчаны «Палескі палітычны дэкалог», які фактычна ўяўляў тэзісы практычнай дзейнасці В. Костэк-Бярнацкага: 1) Палессе – частка Польшчы; 2) паляшук – гэта паляк праваслаўнага веравызнання; 3) праваслаўная царква павінна быць польскай; 4) польская мова з'яўляецца адзінай афіцыйнай мовай; 5) камуністычны рух – «зло», з якім трэба змагацца; 6) неабходна знішчыць «рэшткі насаджанай рускай культуры»; 7) беларускі, украінскі рухі пагражаюць цэласнасці дзяржавы, польскім нацыянальным інтарэсам; 8) перанасяленне трэба вырашаць праз дапушчэнне мясцовых сялян да гандлю і рамяства; 9) неабходна забяспечыць сялян зямлёй; 10) увядзенне раўнапраўя мясцовага насельніцтва і асаднікаў[1]. Як слушна адзначыў пазней на старонках мясцовага друку адзін з палітычных апанентаў палескага ваяводы, гэта цалкам адпавядала ідэалогіі Лагера нацыянальнага аб'яднання (Obozu Zjednoczenia Narodowego)[2], які належаў да апазіцыйных правых польскіх сіл.

У канцы 1930-х гг. Палессе працягвала захоўваць сваю этнаканфесійную адметнасць, што падштурхоўвала польскія ўлады да ўзмацнення паланізацыі. «Праваслаўная маса на Палессі ў палітычных і нацыянальных адносінах уяўляе сабой яшчэ не сфарміраваны элемент, прыдатны наогул да дзяржаўнай польскай асіміляцыі»[3]. У студзені 1939 г. у Палескім ваяводстве праваслаўныя складалі 77,76 % жыхароў, каталікі лацінскага абраду – 11,36 %, каталікі ўсходнеславянскага (візантыйскага) абраду – 0,24 %, іўдзеі – 9,33 %[4]. Ваяводскія ўлады прызнавалі, што праваслаўнае насельніцтва падвяргаецца павольнай паланізацыі[5]. Аднак планавалася паскорыць гэты працэс. Менавіта гэтае і іншыя пытанні канфесійнай палітыкі абмяркоўвалі на асобнай канферэнцыі ў Варшаве 14 лютага 1939 г. Паводле В. Костэк-Бернацкага, «пагроза для Палесся зыходзіла з поўдня ў выніку дзейнасці ўкраінскіх місіянераў... Асяродкам беларуска-ўкраінскага нацыяналізму была семінарыя ў Пінску...»[6]. Аднак нягледзячы на актыўнасць заходнеўкраінскіх партый і арганізацый, асабліва з Галіцыі, ім не ўдалося правесці на Палессі маштабную ўкраінізацыю[7]. Гэтага не дапусцілі ваяводскія ўлады.

---

[1] C. Cichowicz, *Poleski dekalog polityczny*, «Gazeta Poleska», 1938 № 13.

[2] F. Wal, *O program polityczny na Polesiu. Na marginesie «Poleskiego dekalogu politycznego»*, «Kurier Poleski». – 12 kwietnia 1938.

[3] ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 10. – Спр. 2305. – Арк. 32.

[4] Там жа, арк. 30.

[5] *Polski stan posiadania na Polesiu*, s. 20.

[6] ДАБВ. – Ф. 1. – Воп. 10. – Спр. 2305. – Арк. 31–37.

[7] Вабищевич, А.Н. Общественно-культурная жизнь украинцев в Полесском воеводстве в 1921–1939 гг. / А.Н. Вабищевич // Вісник Харківського національного ун-ту ім. В.Н. Каразіна. – 2006. – № 728. Історія. – Вип. 38. – С. 310.

У падрыхтаванай ваяводскім упраўленнем у маі 1939 г. запісцы «Польскі стан валодання на Палессі» для ўзмацнення польскага ўплыву ў рэгіёне быў прапанаваны комплекс мер у розных напрамках сацыяльна-эканамічнага, нацыянальна-культурнага і канфесійнага жыцця[1]. Асаблівы акцэнт рабіўся на меры ў культурна-моўнай сферы: відазмяненне г. зв. «крэсовых законаў» 1924 г. для скасавання права на магчымасць выкарыстання беларускай і ўкраінскай моў; закрыццё прыватнай рускай гімназіі і пачатковай школы ў Брэсце; недапушчэнне на тэрыторыю ваяводства ўкраінскіх, беларускіх, рускіх арганізацый; выдаленне чыноўнікаў, настаўнікаў няпольскай прыналежнасці і замена іх выключна палякамі ці паланізаванымі палешукамі[2]. Прадугледжваўся цэлы шэраг мер ў напрамку паланізацыі праваслаўнай царквы[3]. Сярод мер у канфесійным жыцці неабходна таксама адзначыць ліквідацыю неаўніі, перадачу яе пляцовак рымска-каталіцкай царкве; замену ў праваслаўных юліянскага календара на грыгарыянскі; утварэнне праваслаўнай семінарыі. Выказваліся прапановы па фінансавай падтрымцы будаўніцтва сеткі пачатковых школ, асабліва ў «бясшкольных акругах», адкрыцці новых ніжэйшых прафесійных школ, пашырэнні сеткі бібліятэк, народных дамоў і г. д.[4]. Прапаноўвалася правесці каардынацыю і інтэграцыю ўсіх польскіх культурна-асветніцкіх таварыстваў, уніфікацыю маладзёжных і жаночых арганізацый[5].

У сельскай гаспадарцы і аграрных адносінах прапаноўвалася паскорыць ліквідацыю цераспалосіцы, павелічыць капіталаўкладанні ў меліярацыю, захоўваць пазіцыі палякаў ў землеўладанні і не дапускаць да яго прадстаўнікоў няпольскага насельніцтва. У гарадах і мястэчках эканамічныя пазіцыі належалі яўрэям. Напрыклад, у Палескім ваяводстве ў 1939 г. у прамысловасці яўрэйскіх уласнікаў было 59,6 %, у гандлі – 70,9 %, у рамястве – 76,1 %. Польская прысутнасць там складала адпаведна 23,7 %, 16,1 % і 9,8 %. Мясцовыя палешукі мелі таксама слабыя пазіцыі – адпаведна 15,7 %, 12,7 %, 13,9 %[6]. З 24 229 аб'ектаў гарадской нерухомасці ў Палескім ваяводстве ў 1939 г. 16,3 % належала палякам, 46,2 % – яўрэям, 36,2 % – «тутэйшым»[7]. Менавіта таму большасць прапаноў у галіне кааперацыі была накіравана на істотнае аслабленне пазіцый яўрэяў у гаспадарчым жыцці: патрабавалася рэзка абмежаваць для іх ліцэнзіі на дрэваапрацоўку, гандаль жывёлай, рыбай, забараніць гандляваць збожжам, манапольнымі таварамі, займацца

---

[1] *Polski stan posiadania na Polesiu*, s. 81–110.
[2] Tamże, s. 82–83.
[3] Tamże.
[4] Tamże, s. 84.
[5] Tamże, s. 85.
[6] Tamże, s. 56.
[7] Tamże, s. 63.

аўтобуснымі перавозкамі, прымусова выкупляць у іх млыны для наступнай іх перадачы дзяржавай польскім уладальнікам. Патрабавалася не выдаваць субсідыі і крэдыты для яўрэйскіх беспрацэнтных кас, іх паступовая ліквідацыя, закрыццё яўрэйскіх гаспадарчых, грамадскіх арганізацый і іх навучальных установ. Меркавалася працягваць перасяленне польскіх купцоў і рамеснікаў з заходніх зямель Польшчы, выдзяленне ім доўгатэрміновых крэдытаў, падатковых ільгот[1]. Прапаноўвалася таксама паляпшэнне гарадской інфраструктуры, добраўпарадкаванне гарадоў, ахова помнікаў, павелічэнне польскага ўплыву ў вольных прафесіях. Аднак пачатак Другой сусветнай вайны перашкодзіў рэалізацыі дадзенага праекта.

Дэмаграфічныя працэсы на Палессі складваліся не на карысць польскай супольнасці. Нягледзячы на высокі ўзровень смяротнасці, Палессе мела ў канцы 1930-х гг. самы высокі не толькі ў межах Польшчы, але і Еўропы паказчык натуральнага прыросту – 19,2 % у год. Пры гэтым лепшыя паказчыкі мела якраз беларускае насельніцтва (19,4 %) у параўнанні з палякамі (17 %)[2]. У такіх абставінах ваяводскія ўлады лічылі, што «трэба пастаянна ўзмацняць працэс асіміляцыі і паланізацыі, бо іншым шляхам колькаснай перавагі польскага элементу на гэтай тэрыторыі не дасягнуць»[3].

У цэлым, у міжваенны час польская адміністрацыя ў сваёй практычнай дзейнасці імкнулася ўлічваць адметныя рысы сацыяльна-эканамічнага, культурнага і этнаканфесійнага жыцця палескага рэгіёна. Ажыццяўляліся спробы, асабліва ў 1930-я гг., увядзення ў дзеянне асобных элементаў рэгіяналізацыі, аднак яны не былі аформлены ў выглядзе асобнага праекта (накшталт «валынскага»). Палескі ваявода В. Костэк-Бярнацкі быў катэгарычным праціўнікам падтрымкі беларусаў, украінцаў, а мясцовых палешукоў, якія не мелі ў пераважнай большасці сфарміраванай нацыянальнай свядомасці, трактаваў у якасці пераходнага тыпу да польскага этнасу. Палессе ўяўлялася своеасаблівым «клінам» паміж заходнебеларускімі і заходнеўкраінскімі землямі, бар'ерам для распаўсюджвання ўкраінскіх уплываў на поўнач. Палітыка польскіх улад была накіравана на ўніфікацыю палескага рэгіёна ў межах Польскай дзяржавы, нацыянальна-культурную асіміляцыю і паланізацыю мясцовага насельніцтва. Канкрэтныя мерапрыемствы ў напрамку паланізацыі цесна звязваліся з правядзеннем каланізацыі Палесся, якая на практыцы ў асноўным не была рэалізавана. Да канца 1930-х гг. не ўдалося вырашыць задачы цывілізацыйнага ўздыму Палесся, таму даволі вострым засталося аграрнае пытанне, слабой была

---

[1] Tamże, s. 85–88.
[2] Tamże, s. 17–18.
[3] Tamże, s. 18.

ступень урбанізацыі, назіраўся высокі ўзровень непісьменнасці, нязразвітасць сацыяльна-культурнай сферы, транспартных камунікацый і іншых сацыяльназначных бакоў грамадскага жыцця.

**Aleksandr Vabishchevich**

The author studied projects implemented by the central and regional Polish authorities to integrate the voivodeship of Palessie within the II Recz Pospolita. Palessie was regarded as the northern buffer against West-Ukrainian influence. The Polish authorities focused their policy on assimilation and Polonization of the local population. It has been established that the Polish administration failed to fulfill the plans of consistent Polish colonization of the voivodeship of Palessie. Though the authorities tried to take into consideration social, economic, ethno-cultural and confessional features of this region, they failed to solve social problem – agricultural issues, illiteracy, economic backwardness, welfare, transport and communications, etc. Palessie colonization failure can be accounted for by both subjective and objective factors.